Ганна Харытончык



# Драня

Жылі-былі ў адной беларускай вёсцы дзед і баба. Жылі яны не тужылі, гаспадарку трымалі, агародам займаліся.

Захацелася аднойчы дзеду бліноў, а мукі дома не было, затое бульбы ўдосталь. Баба яе пачысціла, памыла, нацерла на дробнай тарцы, дадала свежай цыбулі, солі і спякла на алеі цэлую гару румяных духмяных дранікаў.

Наеліся дзед з бабай ад душы, і застаўся на талерцы апошні дранік, паліты смятанай. Вынеслі яны яго на ганак. Можа, хто і з’есць апошні блін. І пайшлі яны па сваіх справах.





Унюхала Кошка смятану і адразу прыбегла на ганак паласавацца. Раптам дранік ажыў і сказаў:

— Не еш мяне, Кошка, я табе песеньку праспяваю:

Я вясёлы Драня,
Абмазаны смятанай,
Жыў у бабы з дзедам
Я аж да абеду.
Не хачу сядзець,
Хачу свет паглядзець.

Заслухалася Кошка, нават вочы ад асалоды прыплюшчыла, а Драня тым часам і ўцёк.

За варотамі сустрэўся яму Шчанюк, які з раніцы яшчэ не еў. Падышоў ён да Драні бліжэй і сказаў:

— Ідзі сюды, я цябе з’ем.

А Драня ў адказ песеньку сваю праспяваў:

Я вясёлы Драня,
Абмазаны смятанай,
Жыў у бабы з дзедам
Я аж да абеду.
Не хачу сядзець,
Хачу свет паглядзець.
Я ад Кошкі ўцёк,
І ты, Шчанюк, не возьмеш на зубок!

Пад гэтую песеньку Шчанюк пачаў круціцца вакол сябе, а Драня — ізноў уцёк.





Дабег ён да пашы, дзе пасвіліся авечкі. Убачыла Драню маленькае Ягня і пачало з ім гуляць, а Драня яму і праспяваў:

Я вясёлы Драня,
Абмазаны смятанай,
Жыў у бабы з дзедам
Я аж да абеду.
Не хачу сядзець,
Хачу свет паглядзець.
Я ад Кошкі ўцёк,
Шчанюк амаль не ўзяў на зубок.
З ім сяброўства не знайшоў,
Да цябе гуляць прыйшоў.

На шум прыйшоў Баран, убачыў Драню і не зразумеў, хто гэта такі. Ён баднуў яго так моцна, што той паляцеў аж на ўскраек лесу, што быў побач з пашай.

Засумаваў Драня і пайшоў па лясной сцежцы, а насустрач яму — Лісіца. Пачула хітруня водар смятаны і захацела з’есці Драню.

А Драня ёй песеньку праспяваў:
Я вясёлы Драня,
Абмазаны смятанай,
Жыў у бабы з дзедам
Я аж да абеду.
Не хачу сядзець,
Хачу свет паглядзець.
Я ад Кошкі ўцёк,
Шчанюк амаль не ўзяў на зубок.
З ім сяброўства не знайшоў,
Да Ягня гуляць прыйшоў.
Там Баран не разабраўся
І рагамі так бадаўся!
А цяпер хачу, Лісіца,
Я з табою весяліцца.



Толькі Лісіца хацела схапіць Драню, як раптам пачула галасы людзей. Спалохалася яна і ўцякла, а праз хвілінку на палянку выйшла дзяўчынка Анюта з кошыкам ягад.

Убачыла яна Драню, здзівілася і спытала, хто ён і адкуль. Заспяваў Драня сваю песеньку:

Я вясёлы Драня,
Абмазаны смятанай,
Жыў у бабы з дзедам
Я аж да абеду.
Не хацеў сядзець,
Хацеў свет паглядзець.



— Ведаеш, Драня, я таксама люблю падарожнічаць. Наша сям’я часта наведвае розныя гарады Беларусі. Хочаш, мы возьмем цябе з сабой?

— Канечне, — узрадаваўся Драня. — Я з вялікім задавальненнем стану тваім сябрам.

Так пачалося сяброўства Ані і Драні. Гэта казка заканчваецца, а прыгоды Драні толькі пачынаюцца…